# *Нямецка-савецкая вайна (чэрвень 1941 г.)*

**Багацэвіч Галіна, Орля:**

Калі 22 чэрвеня 1941 года немцы напалі саветаў, то рускія ў Орлі мелі ўсе машыны разабраныя для ачысткі. Некаторых з іх нават жонкі наведалі, а тут Бельск бамбяць. А наша сям'я і яшчэ іншыя нават уцешыліся, бо ўжо былі вызначаны для вывазкі ў Сібір; гаварылі, што нас вывезуць і мы ўжо былі гатовы, тата ўжо нават куфар завязаў.

**Баравік Аляксандр, Стары Корнін:**

А пачалося ўсё гэта так: калі ўспыхнула апошняя сусветная вайна нямецкія полчышчы бесперашкодна перліся на ўсход. Чырвоная Армія не змагла стрымаць наступу агромнай сілы ворага і адступала, але абаранялася. Вось і ў альшынках за Старым Корнінам, па дарозе ў Карыцціскі, заняла абарону цяжкая артылерыя чырвонаармейцаў, наводзячы агонь у напрамку Дубіч-Царкоўных. Праз цэлую ноч гудзела перастрэлка і здавалася, што шыбы з вокан павыпадаюць. А на досвітку ўсё прыцціхла, з-за лесу выкацілася сонейка, расспяваліся птушкі, пачынаўся цёплы дзень. Рускія адступілі на ўсход, у Белавежскую пушчу. А мясцовыя людзі пачалі няспешна збірацца, абмяркоўвалі падзеі апошняй ночы, гадалі пра невядомую будучыню — як жыць, куды дзецца. Адны немца хвалілі — за яго парадак, за дысцыпліну; іншыя — кляйміліі ўсяляк абзывалі. Спрачаліся мужыкі з сабою, амаль не сварыліся.

Падлеткаў цікавілі іншыя справы: што там за вёскай, дзе ўсю ноч білі гарматы? Мішка Тыханюк, Ванька Русак, Андрушка Гарасімюк і я мелі ўжо па пятнаццаць гадоў, ужо пра дзяўчат неаднойчы пагаворвалі, але яшчэ ў нас засталіся і шматлікія дзіцячыя захапленні. І мы рашылі цішком, каб адно дарослыя не даведаліся — бо бядовая справа тады была б — шмыгануць за вёску, на месца рускай абароны. Пабеглі ў альшынку і аж ахнулі ад нечаканасці — колькі там убачылі пакінутага дабра! Ля-

жалі палаткі, пледы, шынялі, мундзіры... І нешта жоўтае ў каробачках, быццам макароны. Пасмакавалі — непрыемнае, цвёрдае. Нехта азваўся:

— Гэта ж порах!

Здорава! Калі так, дык трэба яго забраць. Ён слаўна гарыць, можна такое відовішча паказаць, якога яшчэ не было! І давай запіхаць яго за пазуху. Але схамянуліся: вёска згарэла, усё патрэбнае для дому. Кожны разаслаў палатку і давай класці на яе што пападала пад руку. Кожны адно сопад руплівасці без аглядкі.

Раптам прастору прарэзаў незразумелы крык: Гэндэ гох! Ад страху хлопцам аж у вачах пацямнела, нават адагнуцца не маглі. Мяне пасля неаднойчы трывожыў той голас, але не быў ён ужо так страшны, як тады. За намі стаяў немец з пісталетам накіраваным у наш бок і штосьці злосна шваргітаў паказваючы ў напрамку лесу. Пасля паклікаў другога немца і яны нешта шваргіталі, паказваючы ў наш бок. А мы забылі, на якім свеце знаходзімся, не ведалі што з імі робіцца, адно збялелі як палатно — думалі: хана ўжо! Немцы паклікалі яшчэ трэцяга свайго таварыша — мабыць за дарогай іх яшчэ больш было — і, відаць, рашалі пра наша жыццё. Той трэці падышоў бліжэй нас і па-польску пачаў распытваць: хто мы, адкуль, як называемся, чаго шукаем, навошта ўзялі рускія мундзіры і порах. А мы, перапалоханыя, сталі адзін перад другім апраўдвацца: што мы пагарэльцы з суседняй вёскі, шукалі свіней у кустах і знайшлі толькі дабра, а нічога дома не маючы хацелі ўзяць рэчы сабе.

— А порах каму? — спытаў немец.

— Таксама сабе, для гульні.

Аднак немец, відаць, не верыў нам. Пярэчыў нам і перабіваў. Пасля махнуў рукою, адышоў да сваіх і сталі пра нешта шваргітаць паміж сабою. А мы не ведалі ці яшчэ жывыя, стаялі як на судзе. І сапраўды — прыгаварылі нас на смерць. Той, што па-польску гаварыў, загадаў нам скінуць абутак і ўлазіць у яму ад снарада. Піхануў ён нас у яму і адышоў некалькі крокаў.

Грымнуў выстрал і Ванька абсунуўся як падрэзаны. Наступны быў Андрушка. А пасля пісталет заглох, мабыць, застапарыўся. Немец ругаўся і трос пісталетам. А я з Мішкам як па камандзе выскачылі з ямы і ў ногі ў розныя бакі; і немцы кінуліся за намі. Не прыгадваю як бег, але немец аставаўся ззаду — я быў малодшы і ад смерці ўцякаў. Але з'явілася і наступная бяда: пачуў я за сабою екатанне сабакі. Сабака схапіў мяне за нагу, але я вырваўся ад яго і далей у ногі. Сабаку быццам адхацелася гнаць мяне. Немец нацкаваў і сабака неахвотна пабег за мною. Я дабег да дарогі, паабапал якой у равах стаяла крыху вады, і рашыў бегчы па вадзе, пахіляючы як найніжэй галаву. Сабака крыху пад-

бег дарогаю і спыніўся. А я бег і бег, абы як найдалей ад таго месца, дзе асталіся мае забітыя сябры. У рове было штораз больш вады і дабегшы да мастка я выскачыў на дарогу, а затым павярнуў у дарожку, якая вяла ў поле, у жыта. Паскорыў, пачуў яшчэ пару выстралаў, якія свіснулі каля галавы, і ўсё прыцціхла. Дабег у жыта, куля яшчэ раз зашамацела па збожжы. Прыгнуўшыся дабег да свайго поля, пад дзікую грушу, што там расла. Упаў пад ёю і расплакаўся — астаўся ў жывых.

Усё прыцціхла. Але зараз думкі пачалі, як дурныя, кружыць па галаве — у чым жа я вінаўны і ці будуць далей шукаць мяне? Колькі часу так мінула — не помню, бо час спыніўся мне ў той апальнай яме. Пралежаў так да вечара і толькі тады стаў я прытомнець. Паціху падняўся на здранцвелыя ногі і разглянуўся кругом. Цішыня як перад бураю, нікога і нічога падазронага не відаць — быццам і вайны не было. І ўсё, што ўдзень перажыў, гэта быццам сон быў. Але не быў гэта сон, гэта праклятая вайна нам бяду прынесла; дзякуй Богу, што ў жывых астаўся. Падумаў, што пара ў хату, да сваіх.

Павольна рушыў, дайшоў да лужка, на якім пасвілі кароў, спыніўся перад адкрытаю прасторай: а што далей, мо цікуюць за мною? Але не — каб сачылі, тады з сабакамі шукалі б, а навокал жа цішыня. Падышоў да кароў і бачу, што старая суседка карову доіць, прысеў каля яе, маўчу. І яна маўчыць. Мо ведае пра нашу справу, мо ведае, хто загінуў. Але пытаць не буду, гэта зацяжка мне — мо і бацькі яшчэ не ведаюць?..

Суседка падаіла, узяла вядро з аднаго боку, а я з другога і так пайшлі ў вёску. Ішлі моўчкі — мо так і лепш, падумаў я. Дайшлі да мастка, я разглянуўся, але нічога падазронага не прыкмеціў. Да вёскі дайшлі моўчкі, вулачкамі выйшлі на вуліцу, а наўскос наша хата. Праз вуліцу шмыгануў як злодзей, думаў што ўсе на мяне ўзіраюцца, быццам я нейкім злачынцам быў.

У хату ўбег бягом, а ўсе ў плач і крык. Пасля сталі абдымаць, цалаваць і распытваць. А я нічога не магу сказаць, слова не магу прамовіць. Гляджу на ўсіх і маўчу; здавалася, што маўчаць ужо буду назаўсёды. Але пасля дзвюх гадзін загаварыў.

Мішку немцы многа не гналі; пабег ён у напрамку царквы. Загінулі толькі Ванька і Андрушка. Так пачалася вайна.

**Белая Люба, Беласток:**

Калі напалі немцы, рускія ўцякалі самаходамі і паяздамі: сем’і, войска, НКУС. Немец бамбіў і па шашы біў. Насупраць нашай вёскі збамбілі поезд з уцекачамі. Мая сястра пайшла туды паглядзець. Там ляжала руская раненая з дзіцём, якая прасіла каб іх або хаця самое дзіця

забраць. Сястра пра гэта вечарам расказала, плачучы, а на золаку тата паехалі і тую жанчыну з дзіцём прывезлі да хаты; Маруся і Шурык Матвеевы яны называліся. У яе з пахвіны быў вырваны кусок мяса. Лекараў тады не было і нашы парылі рамонак і тую рану прамывалі; яна енчыла. Праз тыдзень прыйшлі немцы, яна прасіла лекара. Тата неяк з немцамі дагаварыліся і прывялі нямецкага лекара; а ў яе ўжо чорныя пухіры былі. Ён зрабіў укол, выйшаў у сені і сказаў тату па-польску, што нічога ўжо не будзе. І яна пасля дня-двух памерла і мы яе пахавалі ў Гарадку.

Перад смерцю дала яна нам адрас свае маці і мужавых бацькоў. Мы перапісваліся з яе маці Праскоўяй Каралёўнай; яна прасіла прыслаць ёй унука. Але тата мой не хацеў гэтага рабіць, думаў — застарая ўжо. І так той Шурык у нас жыў. Пасля вайны выявіўся яго бацька і стаў хадайнічаць за вяртанне сына. Міліцыя да нас прыходзіла, каб Шурыка забраць, а ён не хацеў нікуды ад нас ехаць, хаваўся перад міліцыяй. Усё ж такі мы вырашылі адаслаць яго бацьку... І насільна яго пацягнулі; ён плакаў і мы ўсе плакалі.

Прайшло мо чатыры-пяць дзён пасля ад'езду Шурыка і мы атрымалі вестку, што Шурыкаў бацька загінуў у выпадку. Тата мой адразу паехаў у Беласток, каб даведацца ці Шурык яшчэ ў Польшчы, але яму адказалі, што Шурыка ўжо ў Польшчы няма. Мы яшчэ перапісваліся з яго бабай, але ён не хацеў нам пісаць — так ён моцна загневаўся, што мы аддалі яго быццам у сірочы дом.

Уцякаў на ўсход і загадчык НКУС з Заблудава. Жонку і сына ён успеў загрузіць на самаход, а сам яшчэ хацеў забраць дачку, якая тады на летніку была. І яны ўжо не ўспелі выехаць, толькі асталіся ў Дзерняковe жыць. Немцы яго ўскрылі і загадалі ў Міхалова мельдавацца. Ён у вёсцы гаварыў што ходзіць у Міхалова, але заміж таго ён пачаў хадзіць кругом і арганізаваць партызанку. Аднойчы, калі ён быў у дзядзькавай хаце, немцы акружылі хату і забралі яго разам з дзядзькам...

Яго дачка асталася ў нашай цёткі. Яе сыны, Міхал і Аляксандр Храноўскія, якіх імёны пасля вайны прысвоены школе ў Гарадку, пайшлі ў партызаны і загінулі. У 1959 годзе знайшлася маці тае дзяўчыны, прыязджала ў Дзернякова. Цётка тую дзяўчыну выгадавала, узяла ёй у сваю хату прымака... А пасля яны яе з хаты выгналі і яна ў Ялоўцы дажывала.

Яшчэ адзін рускі ў нас быў, ён у партызаны пайшоў, у Майдане дзяўчыну згвалтаваў і яго самыя партызаны забілі.

**Берасцюк Антон, Шашылы:**

Каля Шашылаў баёў не было. Да вайны рускія ішлі на захад, на ўмацаванні, цягнулі танкі, артылерыю, узбраенне. Як немец Боцькі збамбіў, то рускія сталі ўцякаць.

На другі дзень у нашу вёску прыехала траіх немцаў на матацыкле з калыскай. У нас адзін умеў па-нямецку гаварыць і паказаў ім дарогу ў Вульку і Чахі. Пагаварылі, пасмяяліся і паехалі.

**Грыгарук Марыя, Янова:**

Настала вайна, але не адчулі мы яе моцна. Факт, страх быў, слёзы. Чалавек бачыў і смерць, і людское гора, аднак вайна загартоўвае на ўсё. Цераз нашу хату прайшлі шматлікія яўрэі, якія ўцякалі ад немцаў, партызаны, руская армія. Усе чагось хацелі — то білі, то нішчылі, потым адыходзілі. А чалавек жыў далей. Калі пачалася бамбардзіроўка ў 1941 годзе, загарэлася наша абора. Сталі ратаваць кароў і тады асколкі паранілі мне твар. Пакалечыла амаль цэлы правы бок твару. Можна сказаць, што мела я шчасце, аднак у той дзень ускладнілася маё жыццё.

Вайна закончылася, а я жыла разам з бацькамі. Нейкі час я саромелася свайго выгляду, не хацела сустракацца з людзьмі. З часам суседзі прывыклі да мяне такой і я пагадзілася з гэтым. Замуж я не выйшла — пасля выпадку не думала аб такіх справах, але дзякуючы добрым суседзям заўсёды ёсць каля мяне асоба, якая мне дапаможа.

**Жак Ян, Каўпакі:**

У саракавым годзе зноў саветы бяруць у войска, у Беласток, у сувязь. Патрымалі два месяцы і пусцілі дадому. Як блізілася вайна, зноў змабілізавалі, у Заблудаў, у ваенкамат. Сагналі дзень ці два перад вайною можа з тысячу чалавек. Палітрук, калі ўжо вайна пачалася, вывеў нас на пляц пад адкрытым небам і нам там выклад рабіў. То я выступіў і кажу: „Таварыш палітрук, нехарашо дзелаеце". — „А что такое?" — „Вы вывелі нас у чыстае поле, а, відзіце, самалёты нямецкіе летают. Нас, як агледзят, як наліцят, то нас усіх тут пабамбят". — „Ну, харашо", сказаў і завёў нас пад дрэвы. Прайшло мо з паўгадзіны, ляціць эскадра нямецкіх самалётаў, можа з шэсцьдзесят штук. А пад Заблудавам, у бок Бельска, каля вёскі Сольнікі быў збудаваны аэрадром, і там ужо савецкія самалёты стаялі. А ў той дзень закамандавана было чысціць бронь і ўсе самалёты былі разабраны для чышчання, і артылерыя была разабрана, відна ўжо гэта паддзелка была. То як наляцелі, то і той аэрадром разбілі, і Заблудаў часткова пабілі, гарэў. І той пляц, на

якім мы абучаліся, таксама збамбілі. І камандзіры тады сказалі: „Трудно, теперь кто куда хотит, домой, бо мы не успеем вас обмундировать”. Ну і я вярнуўся дадому.

**Зінчук Аляксандр, Бацюты:**

Нямецкае наступленне не закранула нашай вёскі. У першы дзень толькі станцыю пабілі і на шашы каля пуцёў будынкі разляцеліся. А ў Канцавізне, дзе жыла радня майго бацькі, рускія ўсё ў альшыне пакідалі і ўцякалі хто як мог.

**Кавальчук Ян, Чаромха:**

Як немец пайшоў на Расію ў 1941 годзе, мы апынуліся на лініі фронту. У час адной атакі старшына загадаў: „Таварышчы, на врага!” А я яму кажу: „Дзе нам ісці з вінтоўкамі на танкі”. Уцякаючы ад немцаў, мы апынуліся ў Журобічах. Там пераапрануліся ў цывільнае адзенне і па некалькі чалавек вярталіся дамоў. Нас было трое: Старчэўскі з Москаўцаў, Галёнка з Кляшчэляў і я. На дарозе за Мілейчычамі схапілі нас немцы. Загналі на мілейчыцкі зборны пункт, а пасля ў Кляшчэлі, і на канец у Бельск-Падляшскі. Па дарозе ў Бельск, каля Сухавольцаў, немцы ўбачылі двух рускіх салдат на конях. Думалі, што гэта руская разведка. Спынілі калону, а нас узялі на прыцэл пад кулямёты. Рускія праехалі спакойна і мы пайшлі далей. Ледзь нагамі валачылі ад стомы і голаду.

У бельскім зборным пункце накармілі нас варанай канінай і пагналі ў напрамку Малкіні. Крыху спыніліся мы ў вёсцы Новы Нур, а пасля праз Малкіню пайшлі на Остраў-Мазавецку.

Праходзілі мы праз гэты горад і адна з мясцовых жанчын кінула нам бохан хлеба. Гэтага, хто яго злавіў, палонныя задушылі, выдзіраючы яму хлеб. Жанчыну немец адразу застрэліў.

Апынуліся мы ў цэнтральным лагеры каля Ломжы. На работу гналі нас у Ружанскі лес. Там грузілі мы аграмадныя снарады. Адзін несла па сем чалавек. На гэтай рабоце прайшло нам каля паўгода часу. Пасля зноў загналі нас у Остраў-Мазавецку, саставілі спіскі палонных. Нас, мясцовых, адпусцілі дамоў. Рускіх вывозілі ў Кентшын на будову бункера для Гітлера.

Адпускаючы дамоў, немцы забіралі ў нас лепшы абутак ды адзенне і давалі рускім.

З палону вяртаўся я з Мікалаем Высоцкім з Чорнай-Царкоўнай і Ігнацым Галімскім з Кажанюўкі каля Драгічына.

Сустрэча са сваякамі ў Макарках, што каля Гродзіска, аказалася даволі непрыемнай. Мяне палічылі бадзягам і не ўпусцілі ў хату. Калі аднак справа высвятлялася, накармілі мяне і далі чыстую вопратку. Пасля адвезлі ў Журобічы, а затым у Касцюковічы. З Касцюковічаў паехалі мы ў Рагачы. Калі я ішоў быў на мабілізацыйную камісію, важыў 108 кілаграмаў. Пасля зняволення засталося 39 кг. Маёй ядой у палоне былі перш за ўсё трава і вада.

**Казбярук Мікалай, Старыя Кухмы:**

Я быў прызваны на вучэнні ды на ныркі захварэў і мяне лейтэнант 15 чэрвеня 1941 года ў шпіталь у Ломжу завёз. У Ломжы праляжаў да суботы 21-га, не мелі чым лячыць і мне ў Беласток скіраванне далі. Прывезлі ў часць і лейтэнант сказаў, што ў панядзелак адставяць мяне ў Беласток.

У нядзелю — налёт! От табе і шпіталь... Я скіраванне лейтэнанту паказваю, а ён:

— Піздзец нам усім, і бальным, і здаровым. Ступай на фронт!

У нас мо з 50 машын на слупках стаяла. Наляцела мо з 18 самалётаў. І па тых машынах, не па нас, зайгралі. Пабілі машыны і паляцелі. А нас на перадавую, у акопы, на дапамогу пагранічнікам, кінулі. Немцы б'юць, а нам страляць няма дазволу. Пазавальвала многіх салдат.

Пралежалі да адвячорка, пакуль сцямнела. Падцягнулі гарматы, 50 штук, і па немцах! Немец заціх... Але пайшоў сторанамі. І мы — адступаць. Адступаем пяхотаю, бо машыны разбітыя. Ад Вонсаша да Ядвабнага цэлую ноч ішлі.

У Ядвабным кухня са снеданнем прыйшла. Паявіўся налёт і кухня „удрала". Нас у Візну пагналі, мост дзіравы ладзіць. Я паказваю паперы, што хворы, але — работай! Мы бэлі таскалі, дзіры пазалатвалі, машыны прыгатовілі. Машыны сталі ісці і зноў налёт! Лейтэнант кажа: Удзірайма! Мы да сваёй машыны, а па ёй і след прастыў.

Пайшлі пяхотаю. Мелі сухі паёк: цукар у костках, сухары і ваду ў біклажцы. Узброеныя былі ў аўтаматы-дзесяцізарадкі, гранаты і па 50 штук патронаў. Паелі сухары, ваду выпілі. Пасля бабкі нам малако выносілі і хлеб давалі.

Развіднела. Рускія да нас:

— Вы ізменшчыкі, куды?

— Сваёй часці шукаем, — адказваем.

Пасадзілі нас на дарозе і заявілі:

— Падаждзіце, мы з вамі разлічымся!

З'явіўся наш камандзір роты на сівай кабыле:

— Чаго вы тут сядзіце? — пытае нас.

— Нас арыштавалі, — адказваем.

— Гэта мае байцы, — сказаў ён вартаўнікам, а нам: — А ну, пайшлі!

Зайшлі ў сваю часць. Акопы капаем. Што дзве гадзіны змена. Ноччу збіраемся адступаць, бо немец акружае. Машыны ў рады выстраілі. Я да лейтэнанта звяртаюся:

— Я бальны; не магу ісці, нікуды не дайду.

— Бежыце ў перадавую машыну, — ён да мяне, — паедзем у разведку, бо мы акружаны.

Селі ў машыну з перастаўнымі мастамі: шафёр, два лекары, лейтэнант і я. І загад быў такі: „Пабачыце налёт — у рассыпную!”

Лесам ехалі — нічога. Адно з лесу выхіліліся — тры „страбіцелі” на нас напалі нямецкія. Шафёр і лекары разбегліся, а я з лейтэнантам у шафёрку пападалі. Адзін застрачыў — ніц, другі — ніц, а трэці — ужо чую: лейтэнант крычыць. Машына разбіта. Шафёр і лекары аднеслі нас у лес. У лейтэнанта правую нагу ў калене прастрэліла; у лешчаткі ўзялі, бандажам перавязалі. І мяне праверылі: пяць прастрэлаў між ног у шынелі, прабітая біклажка. Гаворыць мне:

— Ты шчаслівы ў Бога! Адзежа прабіта, а цела не тронута!

Лейтэнанта забралі на насілкі і ў машыну. І зноў налёт! Я да пагранічнікаў далучыўся, 19 іх было. Выкінуў я свой шынель. Падышлі пад Беласток, там 200 салдат да нас далучылася і мы направіліся на Зялёную. Выходзім за Беласток, а там дэсант нямецкі іграе! Мы пападалі і два кіламетры не падымаючы галавы паўзлі. Разбіліся, я з трыма пагранічнікамі астаўся. Падыходзім да лесу, два танкі рускія напроці нас паказаліся і павялі агонь па немцах і тыя заціхлі. Мы павярнулі ў напрамку шашы і тады свабодна ўжо пайшлі.

Выходзім на шашу, а там не пойдзеш — смурод, машыны, крык, віск. Давай мы ад шашы, мо з 200 метраў, і так мы бокам, лесам цэлы дзень ішлі. У Жэдні стала шарэць. Па чыгунцы ўжо нямецкія патрулі ходзяць. Як сцямнела, мы перасяклі чыгунку і направіліся на Саколе, далей ад шашы. Ішлі мы, мо з 200 чалавек, лесам у Майдан і хацелі накіравацца далей у Пянькі. А немцы агонь па нас адкрылі. Мы паляжалі нейкі час, немцы перасталі страляць, і мы пабачылі аганёк, значыць вёска недалёка. Мы на Майдан, зайшлі, пытаем, ці немцаў няма. Адказалі нам, што не відаць, але абстрэл чулі. Сказалі нам начаваць да раніцы. Мы праляжалі хто ў стадолах, а хто дзе, варту выставілі.

Чуць свет мы на Гарадок кіруемся. А немцы падпусцілі нас на дзвесце метраў і зайгралі па нас, не толькі з аўтаматаў, але і з гарма-

так. Давай мы назад. У жыта вялікае пападалі і зноў паўзем. Выпаўзлі на прыгорак, а немцы зноў па нас. Мы сапёрскімі лапаткамі ямкі выкапаем, паляжымо і зноў узад адступаем, бо ўпярод некуды. Адступілі ў лясок, а Сяргей Трахімюк, у якога мы начавалі, кажа:

— Пераапранайцеся, бо немец вас парасстрэльвае, чыкацца з вамі не будзе.

Я аўтамат кінуў, бо — думаю — так ці так немец заб'е. Сказаў гаспадару, каб мае аўтамат і бінoклі забраў. Сказаў толькі Сярожу, — яму тады дванаццаць гадоў было, — каб дзе не страляў. Ён забраў мае прыборы, прынёс мне цывільную вопратку і я пераадзеўся. Але і немец зараз нас заскочыў. Прыгнаў нас у Міхалова, а з Міхалова на Гарадок. У Гарадку ноч пераначавалі і па чатырох у радку пагналі нас, мо з восем тысяч, у Беласток. Немцы на веласіпедах едуць, а мы, як сабачкі, пехатою. Прыгналі нас і на Варшаўскай і Слонімскай нас пасадзілі. Пасядзелі з дзве гадзіны і на аэрадром нас пагналі. Жыдоў аддзялілі і заперлі склады прыбіраць. А нас у двупавярховы будынак уперлі і мы там як свечкі стаялі.

Да раніцы правіселі, а раніцай на пляц паставілі. У каго былі дакументы, таму пропускі давалі; там нас мо з двццаць тысяч народу было. Я ўцешыўся, бо ў мяне дакументы былі. Падышоў, даў пашпарт, атрымаў пропуск. Кажу, што са мною таварышы. Але не: „Дастаў пропуск і — пайшоў, а не, то і цябе забярэм!”

Выходжу я адзін, прыходжу ў Беласток. На Варшаўскай жыў Казік Садоўскі з Ціванюкоў і мы разам з ім і гімназістам з Бераставіцы, што ў яго жыў, намерыліся ісці дадому. Казік пайшоў па дакументы, але няма яго і няма. Гімназіст кажа: „Ідзем!” Даходзім да чыгункі, а там адзін стаіць і кажа:

— Толькі шашою не ідзіце, бо вас заставяць закопваць жывёлу і ўсё, то і не дойдзеце куды вам трэба.

І ён нас направіў побач чыгункі. Мы з гімназістам шпарым праз Жэдню. Там немцы бензін з паяздоў спускалі, але нас ужо не чапалі. На шашы, што ў Міхалова, мы разышліся.

Вярнуўся я дадому на другі дзень рана, пераначаваўшы ў Яна Грыкі ў Азяблах. Бацька ўцешыўся, што я вярнуўся.

У Гарадку сястра, як нас гналі, булку хлеба нам дала і бацьку даказала, што мяне ў Беласток пагналі. І бацька меў каня запрагаць і ў Беласток па мяне ехаць. А тут я сам з'явіўся.

**Казлоўскі Антон, Калодна:**

У нядзелю, 22 чэрвеня 1941 года, нашы пастухі выгналі дабытак раненька, пакуль бонкаў няма, каб пасля перад поўднем зноў прыгнаць і зачыніць. Выгналі і пачулі над Беластокам кананаду. І давай гадаць, што гэта такое: вайна ці манеўры. Але ж манеўраў ніколі над Беластокам не было. Людзі кінуліся да радыёпрыёмнікаў. З Масквы ў эфір ішла лёгкая музыка, а вестак — ніякіх! Мабыць яшчэ не ведалі, ці гэта правакацыя, ці што.

У восем гадзін раніцы паведамілі, што фашысцкая Германія напала на Савецкі Саюз. Было аб'яўлена ваеннае палажэнне ў заходніх абласцях. Склікалі сход, раздавалі мабілізацыйныя павесткі — і тым, што ў 1939 годзе былі прызваны ў польскае войска, і іншым.

Загадалі ставіцца ў панядзелак з мабілізацыйнымі картамі ў сельсавет, а адтуль мелі направіць у ваенкамат у Заблудаў. Баранавіцкай шашою поўна войска валіць — на ўсход. Наляцеў бамбардзіроўшчык, усе разбегліся, пахаваліся. Некалькі танкаў заехала ў Калодна, вадою запраўляліся. І грузавікі, і трактары з гаўбіцамі цягнулі, і пяхота ішла; людзі частавалі іх малаком і хлебам.

Так было тыдзень — ад нядзелі да нядзелі. І толькі на ўсход ішлі. А пазней то ўжо па сем-дзесяць чалавек трыбамі прабіраліся. Прасілі толькі вады, бо яшчэ свой правіянт мелі. І дарогу на ўсход паказаць. Пасля ўжо толькі адзінокія салдаты ішлі.

Адзін, з аўтаматам, з-за стадолы паклікаў майго бацьку і спытаў, куды далей ісці.

— Табе ўжо толькі ў палон, — адказаў бацька, — бо ўсе ўжо адышлі.

— Не, — адказаў салдат падумаўшы, — у палон я не здамся!

І пайшоў далей шукаць сваіх.

Скончылася савецкая ўлада.

**Карчэўская Марыя, Карыціскі:**

Нарадзілася ў я Дубічах. Добра памятаю як немцы ў 1941 г. прыйпші. У нас якраз самы фронт быў. Мы жылі над крамай. Туды савецкія салдаты снарады насілі. Мама і старэйшая сястра ў агародзе сховішча капалі. Сястра там свае падручнікі схавала, яна ў польскай школе вучылася. Гэта ў нядзелю было. А ўжо ў панядзелак немцы пачалі бамбіць Дубічы, а мы не паспелі накрыць схрон. Калі пачалі бамбіць, мы схаваліся ў схрон. Адзін снарад трапіў у хлеў, а асколкі паляцелі ў наш схрон. Сястра загінула адразу, асколак трапіў у сэрца. Параніла

і брата. Калі ўвайшлі немцы, брата аглядзеў нямецкі лекар. А потым яго адправілі ў шпіталь. Паўгода ў шпіталі правёў.

**Касцюк Уладзімір, Козлікі:**

Як у нядзелю, у 1941 годзе, людзі пачулі вайну, то рускія з сем'ямі сталі ўцякаць: хто на машынах, хто на фурманках. Колькі іх на баранавіцкай шашы пагінула!..

У панядзелак наляцела сорак нямецкіх самалётаў і сталі той заблудаўскі аэрадром бамбіць; шмат салдат там загінула. Заблудаў знішчылі амаль датла. І па нашай вёсцы стралялі з кулямётаў, але ніякай шкоды не зрабілі.

**Кондэль Аляксандр, Нурэц:**

Адной раніцы, калі я выгнаў кароў, чуваць было стральбу — гэта немцы з платформаў у Плятэраве білі па станцыі ў Чаромсе; некалькі снарадаў і ў Нурэц папала. Пасля сталі бамбіць з самалётаў. Адзін салдат у самалёт стрэліў, то той самалёт па полі біў, страляў. На працу я ўжо не пайшоў.

Перастрэлкі доўгай не было. Калі немцы перайшлі Буг, рускія сталі ўцякаць куды хто мог. Многа ружжа пакінулі, у балоце на лонках патапілі.

**Лук'янюк Мікалай, Бялкі:**

Памятаю, як у чэрвені, а гэта была нядзеля, пачалі нямецкія самалёты бамбіць Заблудаў, а савецкія дэпутаты яшчэ выганялі людзей вазіць каменне на аэрадром і тлумачылі, што гэта манеўры. У тую нядзелю некаторыя жыхары вёскі павезлі каменне, а некаторыя пайшлі, каб атрымаць грошы. Вярнуўшыся, сказалі, што гэта вайна, немцы напалі на саветаў.

**Масальскі Канстанцін, Фальваркі-Тыльвіцкія:**

Пачатку нямецка-савецкай вайны я не ўсведамляў. Яе першыя знакі я пабачыў, калі будучы ў полі прымеціў вялікі чорны дым, які ўзнімаўся над Беластокам. Невядома чаму я адразу падумаў пра бацьку, адчуваў яго брак у той жахлівы час і маліўся за яго вяртанне.

На досвітку 22 чэрвеня 1941 года бацьку разбудзіў грукат падаючых снарадаў і бомбаў. Маладыя савецкія афіцэры спачатку тлумачылі, што гэта нямецкая вучэбная памылка, аднак высветлілася, што гэта пачатак нямецка-савецкай вайны. Салдатаў вывелі з казармаў і яны ў калонах адступалі. Суцэльнай абароны не было, толькі адзіночныя

часці супрацiўлялiся, аднак перад прыгнятальнай сілай праціўніка вымушаны былі адступіць.

Бацька прыгадваў выпадак, калі па іхняй калоне нехта пусціў чаргу з недалёкай хаты. Аднаго салдата параніла. Тады камандзір загадаў навесці гармату і даць некалькі выстралаў па той хаце. Стральба спынілася і калону больш не чапалі. Падчас адступлення некаторыя палякі сумелі накарміць (пачаставаць хлебам і малаком), а іншыя ставіліся варожа, лаяліся не дазваляючы нават напіцца вады.

У час адпачынку ў лесе калону збамбілі. Салдаты і запасныя разбегліся. Калі бамбёжка супакоілася, адсутнічала многа салдат ды камандзіраў узводаў і рот. У склаўшыхся абставінах нашы згаварыліся вяртацца да сваіх хат. Ружжо пакінулі ў лесе, раскамплектоўваючы яго згодна ранейшым рэкамендацыям камандзіраў; затворы і іншыя прылады закапалі або выкінулі далей. У найбліжэйшай вёсцы бацька з некалькімі знаёмымі папрасілі цывільную вопратку. Далі ім, але распытвалі, дзе ружжо; адказ быў адзін: у лесе.

У рэшце рэшт у напрамку Беластока вярталіся ўтраіх: мой бацька, Русель з хутара Фальваркі-Тыльвіцкія і адзін з-пад Шымкаў. Ідучы крадком лясамі, палямі (паміж збожжа) і дарогамі, днём і ноччу, 27 чэрвеня 1941 года дацягнуліся да Беластока.

Ішлі вуліцамі: Ліпавая, Рынак Касцюшкі, Варшаўская. У той час гарэла сінагога; чуваць было пранізлівы крык жыдоў гарэўшых у сінагозе. Горад быў напоўнены нямецкім войскам, якое перамяшчалася пяшком і на машынах па вуліцах і тратуарах. Шкло з выбітых шыб ляжала на тратуарах, горад гарэў, а яны ўтраіх ішлі паміж тым войскам.

Дайшлі да баранавіцкай шашы (цяпер Баранавіцкая вуліца). Адтуль Русель пайшоў самапасам праз лес; яго там схапілі і адаслалі ў лагер. Бацька з другім пайшлі ў напрамку Заблудава праз вёскі Рахвалаўка і Дабрынёўка. На скрыжаванні дарог з Фальваркаў-Малых у Вялікія і з Жэдні ў Заблудаў іх затрымалі два немцы, якія вялі двух савецкіх салдат. Бацька бачыў слёзы ў вачах тых салдат, якіх немцы зараз расстралялі. Далей немцы пацікавіліся бацькам і тым другім. Сцвярджалі, што яны „Soldaten”. Бацька даказваў, што яны не салдаты, што жывуць у Фальварках-Тыльвіцкіх, называў яшчэ і іншыя навакольныя мясцовасці, а немец параўноўваў гэтыя паказанні з картай. Звярнуў ён увагу, што яны абстрыжаны на бубен. Бацька тлумачыў, што яны вяртаюцца з прымусовых работ на заблудаўскім аэрадроме, паказваў, што нічога ваеннага на сабе не мае. Немцы нешта перагаварылі паміж сабой, адзін махнуў рукою ў напрамку Фальваркаў-Тыльвіцкіх і сказаў „Raus!”. Бацька падумаў, што і ім будзе тое, што двум салдатам. Жу-

дасна зрабілася, што так блізка хаты загіне невядомым — бо не меў ніякіх дакументаў — і сям'я не даведаецца, дзе спачынуць яго косці. Ступілі крок-два і чакалі выстралаў. Калі адышлі з дзесяць метраў упэўніўся, што расстрэлу не будзе.

Прыйшоў бацька на свой панадворак і пабачыў многа немцаў, якія мыліся і даводзілі сябе да парадку. За бацькам у хату ўвайшоў адзін салдат і загадаў бацьку выйсці; крычаў „Raus, Soldat, kaputt!" На мамін і наш — дзяцей — плач, у хату ўвайшоў другі немец, які ўмеў гаварыць па-руску і па-польску. Мама з татам расказалі яму пра склаўшыеся абставіны. Ён выгнаў немца, які хацеў забіць бацьку. Расказаў ён, што перад 1939 годам па загадзе Гітлера ён быў вымушаны пакінуць маёнтак бацькоў каля Гродна і нелегальна перайсці мяжу Усходняй Прусіі. Яго спярша ўзялі на працу пры пабудове дарог і казармаў, а затым прызвалі ў вермахт. Гаварыў, што не хоча забіваць людзей, што Гітлер іх абмануў. Рэкамендаваў, каб бацька не выходзіў з хаты дзеля ўласнай бяспекі. Маме прынёс мыла і масла ў круглай чырвонай баначцы. Мама яму і іншым вымыла бялізну. Частавала свежым малаком і ён гаварыў, што такое малако піў, калі жыў яшчэ з бацькамі. Праз некалькі дзён немцы адышлі.

**Нікалаюк Кузьма, Пілішкі:**

Рана, у нядзелю, сплю на сене і чую: „Гу-гу, гу-гу!" Думаю: не цёмна ў клуні, а грыміць так у чатыры-пяць раніцы. Я выбег на двор — цішыня. І так спакойна стала. Я пайшоў у хату, ніхто нічога не гаворыць, толькі кажуць, што грымела, бо ніхто нічога не ведаў.

Я паснедаў і выбраўся ў Кнаразы на тое вучэнне ў нядзелю. Зайшоў, прыйшоў наш камандзір, выстраіў нас у чацвёркі і забраў нас купацца ў Плёскі. Зайшлі мы туды недзе ў адзінаццаць гадзін. Аж ляціць самалёт і над тою гарой стаў круціцца. Наш камандзір сказаў, што гэта наша вучэбная машына і мы сталі купацца. Той самалёт ляціць зноў і так кружыцца над мостам, што на беластоцкай шашы, мо з паўвярсты ад нас. Сталі ісці рускія самаходы і ён тады спусціўся і та-та-та з кулямёта, але нікога не забіў і самаходы як ехалі, так і паехалі далей. Тады камандзір сказаў нам, што гэта вайна. Мы апрануліся і ўсе разышліся дадому.

Прыйшоў я дадому, і там гавораць, што вайна. Васіль вазіў камяні яшчэ ў нядзелю рана, даехаў да Абрамка, а той кажа яму:

— Чалавеча, куды ты едзеш? Вайна!

Васіль пад'ехаў яшчэ крыху, ажно снарады ляцяць! Высыпаў камяні і завярнуўся дадому.

Мы тады саветам ільнозавод ставілі. У панядзелак наш сусед, які быў падрадчыкам на той будове сабраў нас — такіх работнікаў, хто часаць добра ўмеў, а хто пілаваць — і рана пайшлі мы на працу. Зайшлі, сталі толькі раскладацца, ажно зноў самалёты сталі бомбы кідаць. Тады хто ўспеў сякеру забраць, а хто і не ўспеў, кінуліся напрасткі дадому.

А людзі па-рознаму гаварылі, некаторыя, каму саветы дакучылі, хвалілі, што іх немцы прагналі.

**Панасюк Ніна, Старое Беразова:**

Надышоў сорак першы год, пачатак вайны. Людзі жылі пад страхам, не ведалі, што іх чакае, што ім вайна прынясе. Ведалі адно: дабру не бываць. Пачалі да вайны рыхтавацца і капаць бліндажы, каб у іх падчас фронту схавацца і такім чынам зберагчы сябе. Ведалі, што нашай вёскі, Старога Беразова, бяда ніколі не мінае: з поўдня пралягла чыгунка, а з поўначы шаша — хто ідзе або едзе, вёску закране. Няйначай было і тым разам.

Немцы ўляцелі, быццам на свой панадворак; вядома — пераможцы. Не зналі перашкод, не панюхалі як след пораху, безупынна перлі наперад, на Маскву. У нашай вёсцы разлажыліся на адпачынак, мыліся, галіліся, даводзілі сябе да парадку. Гаварылі: нямецкі салдат заўсёды чысты і акуратны. Gut Soldaten! Мы глядзелі на іх і думалі: „Вось культура, дысцыпліна і акуратнасць! Такія далёка зойдуць, перад імі ўсе на калені ўпадуць. Цікава, што яны з намі пачнуць. Цяпер яны лагодныя, дзеткам шакалад даюць”. Гэта быў толькі момант, неўзабаве пачалася бяда...

Рускія адступалі перад немцамі амаль без выстралаў. У нас, на чыгунцы, стаялі таварныя вагоны, і вось рускія за імі затрымаліся і рубанулі па немцах. Паўстала такая мітусня, што не апісаць. Немцы кідаліся, як апантаныя. Не ведалі, што здарылася, хто іх мог абстраляць, парушыць іх спакой. Яны ж адпачывалі пасля цяжкай дарогі, а тут на табе!

— Ганьба, здрада! — крычалі. — Бандыты, бандыцкая вёска! Трэба яе правучыць...

Іхнія гарматы стаялі ў суседняй вёсцы. Разгарэлася страляніна. Сярод белага дня адкрылася пекла ў нашай вёсцы. Людзі кінуліся хто куды, пачалі хавацца, абы далей ад гэтага пекла.

Наша сям’я пабегла за клуню, там быў наш бліндаж. Малодшы брат Валодзька не схаваўся, адбег крыху і прытуліўся да зямелькі. І там яго спасцігла смерць — побач разарваўся снарад і забіў Валодзьку. Загінуў мой брацік, наш весялун і спявака.

Страляніна раптоўна заціхла. Рускія адступілі ў напрамку лесу; там іх схавала Белавежская пушча. Нам яны нарабілі бяды і клопатаў. Праўда, некалькіх немцаў яны забілі і паранілі, але ад іх дурноты і нямецкай помсты за тое пацярпеў нявінны вясковы люд.

Мы свайго Валодзьку аплакалі. Нарыхтавалі для пахавання. Палажылі ў куце пад абразамі і на наступны дзень мелі хаваць. Але атрымалася інакш.

Немцы, за сваіх калег, рыхтавалі вёсцы пагром. Злавілі на вуліцы пятнаццаць чалавек і прыгналі хаваць сваіх пабітых. Загадалі капаць магілу, паклалі ў яе пабітых і закапалі. Аднаго мужчыну паслалі па гвазды, каб збіць крыж, а тым, што немцаў закапалі, загадалі капаць другую яму. Калі вярнуўся той мужчына з малатком і гваздамі, усіх іх пастралялі. Гэта яшчэ не ўсё было...

Жыхароў вёскі пачалі выганяць з хат на вуліцу, а пасля, як жывёлу, пагналі на луг, што за шашою каля Шастакова. Прыкладамі паставілі ўсіх у шарэнгу, рыхтавалі на смерць. Паставілі кулямёты і чакалі.

Людзі стаялі быццам укапаныя. Не чуваць было плачу дзяцей, ні найменшага шораху. Стаяла толькі мёртвая цішыня, а над людзьмі раздаўся крык вараняці. Сонца хілілася пад вечар. Не адзін тады думаў: „Ці гэтаму дню будзе канец?" Старэйшыя людзі маліліся вуснамі і пыталі Усявышняга: „Госпадзе! За што гэта нам супольную смерць згатаваў?"

Дзеці туліліся да сваіх матак, не ведалі, нявінныя, што гэта ўсё абазначае: тыя, што зранку далі шакалад, цяпер адмяніліся і на іхніх бацькоў крычаць. Дзіўны гэты свет. Што ж зробіш, такая ў іх дзіцячая душа. Таму яны і дзеткамі завуцца, каб не ведалі, што ім жыццё наканоўвае такую долю, каб у маладых гадах развітацца з ім.

Людзі ведалі, што іх чакае. Некаторыя пачалі паціху плакаць, маліцца, жагнацца, прабачэння прасіць. У апошніх хвілінах жыцця хацелі добрымі быць. Калі жылі свабодна, на добрыя ўчынкі вольных хвілін не было.

Вёска тым часам пачынала гарэць. Немцы, як восы, куслівыя былі.

— Гэта вам за бандытаў, за нашых калег, за ганебную смерць нашых салдат! — гаварылі яны.

На лузе час цягнуўся як вечнасць. Раптам прыляцеў матацыкл. У калясцы, як вяпрук, нямчура сядзіць. Штосьці немцы пашваргіталі паміж сабою і ад'ехалі. А тыя, што нас пільнавалі, забралі кулямёты і таксама аддаліліся.

Нейкі час людзі стаялі, як укапаныя. Нічога не гаварылі, быццам нешта абдумвалі. Аж нехта голасна загаварыў: „Людцы дарагія! Бог

нас пашкадаваў. Мы асталіся ў жывых, немцы нас пакінулі. Бяжым хутчэй, хто куды можа!”

І ўсе кінуліся стрымгалоў, абы далей ад таго месца, ад сваёй вёскі.

А ў вёсцы бушавала стыхія. Дым прыкрываў усё неба. На дварэ яшчэ хутчэй пачало змяркацца. Дзень падыходзіў к канцу — такі ён сёння доўгі быў, як вечнасць. Столькі людзі пе ражылі за гэты дзень, а цяпер апынуліся начаваць у суседніх вёсках. З жалем глядзелі, як агонь забірае іх мазолістую, цяжкую працу. А ён бушаваў усю ноч. Зарыва было відаць далёка-далёка. І з гэтай пары сталі гаварыць: „Гэта было тады, калі Беразова гарэла”.

На досвітку людзі вярталіся на свае папялішчы — толькі яны асталіся ад іхняй працы, а ўсё з дымам пайшло. Сярод немцаў былі таксама людзі з сэрцам — некаторым хлявы адчынілі і жывёлу ўратавалі. Людзі пазналі, што нясе ім праклятая вайна.

І цела Валодзькі згарэла. Дзе ён ляжаў, там цяпер помнік стаіць і надпіс на ім, што трагічна загінуў падчас апошняй вайны 1941 года. Вечная памяць яму!

**Паплаўскі Уладзіслаў, Канцавізна:**

Пад вайну саветы стаялі ў Суражы і ў нас у карчах. Біліся каля тыдня, па немцах праз Сураж стралялі, а немцы па іх білі. Самалёты адны і другія лятал і, а мы хаваліся. Калі немец стаў гнаць, то рускія ўсё пакідалі і паўцякалі; аднаго рускага ў нас пахавалі а пасля вайны забралі. Асталіся ў карчах мука і палаткі вялікія, што аднаму не падняць; і самаходы асталіся, і газмаскі. Нашы вяскоўцы ўсё паразбіралі. І я палатку прыцягнуў, а пасля яе рэзалі і падушкі шылі, бо пер’я не прапускала. І выгадна на такой падушцы спаць было, бо калісь выгодаў не шукалі. А муку ў мяшках разабралі.

**Пташынскі Мікалай, Міхнаўка:**

У маі 1941 года мяне і брата змабілізавалі ў савецкую армію. Брата ў Харкаў забралі. Тры пісьмы прыслаў, а чацвёртае калега напісаў, што брат памёр. Пасля, у 1956 годзе, калі я да цёткі ў Маскву ездзіў, даведаўся ад яе, што брат быў памочнікам машыніста, ездзіў на паяздах, якія эвакуіравалі прамысловасць на ўсход. І тыя, што з ім ездзілі, застрэлілі яго, бо з Польшчы быў, значыць — паляк!

А мяне і яшчэ некалькіх ад нас у Асавец змабілізавалі. Там у шатрах стаялі і вучэнні адбывалі аж да вайны. Я акурат варту меў і чуць свет чую: штось гудзіць. І бомбы валяць. Трывога! Зараз нам патроны,

ружжо і вопратку другую выдалі. І на сем кіламетраў у напрамку Ломжы адправілі. Там мы ў сасновым бары акапаліся, а немцы ў доле сядзелі. І на другі бок Бебжы войска самаходамі слалі, але мала хто з іх вярнуўся — немцы вытаўклі.

Мы тры дні трымаліся: нядзелю, панядзелак і аўторак. Спачатку немцы стралялі, а пасля бамбілі, што аж лес варушыўся. Прыйшоў загад адступаць. Мы рана выйшлі на беластоцкую шашу. А з вёсачкі сталі да нас страляць з цэкаэма, але не немцы гэта былі. То рускія гарматамі па той вёсцы і адтуль людзі ў сарочках павыскаківалі.

Каля Чорнай Вёскі акружылі нас, там лес. Пасля налёту шукаю сваіх, але няма. Адзін з Ліды быў і я яму кажу:

— Ніколі ў палон не здавайся і як маеш сілу, то ўцякайма. Я знаю мясцовасць.

І мы лесам выйшлі да вёсачкі, зайшлі ў адну хату, а на нас неяк дзіўна глянулі. А той з Ліды прыгожа па-польску гаварыў.

— Мы з няволі ўцяклі, — кажа.

І тады нас накармілі, пераапранулі, а мы ружжо і амуніцыю пакінулі і разам ідзем дахаты. Дайшлі да Васількава, а адзін чалавек пытае нас:

— З войска?

— З войска, — адказваем.

— Тут немцы, — сказаў ён, — на могілках усіх рускіх выбілі. Лезце на хлеў, у салому, пераначуйце, а заўтра як хочаце.

І мы пасля на заблудаўскую шашу выйшлі. А там два паны стаяць, адзін з Рагазоў, а другі з Браньска — іх немцы з турмы выпусцілі. Ідзем далей разам. Падыходзім да Рагазоў, а ў Іванках два немцы з аўтаматамі да нас: „Halt!” І дакументаў ад нас патрабуюць, а ў ніводнага з нас іх няма, толькі ў таго з Браньска метрыка. І ўжо ў поле нас пхаюць, расстраляць. Але ж адна баба стала плакаць, што сярод нас яе сусед з вёскі. І тыя немцы ёй паверылі і адпусцілі нас.

Мы пераначавалі і я з лідчанінам ідзем далей. Дайшлі да дарогі, што ў Ялоўку, я яго да сябе запрашаю, а ён — не, пайшоў. І ні я ягонага адрасу не меў, ні ён майго і так разышліся.

Пасля тут немцы ўсю Міхнаўку ў Беласток вывезлі, а мне дазволілі ў Ляўкова перабрацца, бо там сваяк солтысам быў.

**Пташынскі Павел, Старое Ляўкова:**

Як прыйшлі саветы, то мяне ў 1941 годзе, як яшчэ холадна было, узялі ў Бельск аэрадром будаваць. Рабочых многа было, аж з-пад Ваўкавыска былі. Здзіралі дзярно, дзе бетон мелі класць — але не ўспелі.

Мне пашчасціла, бо я працаваў ноччу. Ведалі, што будзе вайна, бо войска на захад ішло. На досвітку чуем гул — дваццаць восем самалётаў на нас ляціць. Мы кажам — немец, а рускія — это наши! Але сталі біць, што аж зямля ўгару ўзнімалася. Мы пападалі, і шчасце, што з кулямётаў не стралялі. А хто тады ў бараках начаваў — многа пабілі і паранілі. Пакідалі мы тую работу і хто куды! Я дахаты прыйшоў.

**Пуц Сцяпан, Барысаўка:**

Летам 1941 года ўспыхнула вайна. Я пас кароў, бачу: салдаты адступаюць на ўсход, многа іх, як цёмная хмара; ішлі з 10-й гадзіны раніцы. Прыязджае салдат на кані ў нашу вёску, у суседкі малака просіць. А другі пабачыў і на яго:

— Ах ты, сукін сын, і т.д.

І той бедненькі салдат уцёк. А 2-й гадзіне трэба было нам выганяць коней на пашу. Пасем, а недзе каля 4-й бачым ад Васількова нейкае невядомае войска; гэта былі немцы. Саветы акапаліся ў бярэзінцы на полі і ўспыхнуў бой. Загарэлася вёска: згарэла 7 клуняў і 4 хаты. Саветы палажылі 16 немцаў, аднак немцы ўзялі верх і пад вечар бой сціх. Прыгналі мы коней, а ў вёсцы поўна немцаў, якія раніцаю пайшлі далей.

Нямецкая разведка напаткала ў Лядскім нашых людзей, якія былі мабілізаваны на будову аэрадрома ў Картуз-Бярозе і цяпер вярталіся дадому. Немцы пакалолі іх безабаронных: у адным месцы 4 чалавекі, у другім — 2 і ў трэцім — чатыры. Праз два дні хавалі іх: не пастраляны яны былі, толькі пакалаты; я сам бачыў дзіры ў грудзях і парэзаныя пальцы — відаць бараніліся перад смерцю.

**Пятроўскі Пятро, Орля:**

У 1939 годзе ажаніўся я з аднасяльчанкай Надзеяй Ярымовіч. Пры саветах прызвалі мяне на шэсць тыдняў на ваеннае абучэнне. Завезлі нас у Рудку, а пасля двух тыдняў перавялі ў Чырвоны Бор ля Замбрава. Там нас заспела нямецка-савецкая вайна. Гналі нас шашою, але як за Беластокам надляцелі нямецкія самалёты, усе разбегліся. Потым немцы палавілі нас і трымалі ў Беластоку. Было нас амаль дзве тысячы палонных салдат. Некаторыя яўрэі сталі працаваць у немцаў перакладчыкамі, іншыя папалі ў абслугу кухні. У лагеры сядзеў таксама арлянскі яўрэй Ёлка Лімански (у Орлі жыў ён у будынку сённяшняй амбулаторыі), які інфармаваў мяне, што з намі будзе. Спачатку адпусцілі яўрэяў — немец на развітанне біў іх пры браме розгай. Нам загадалі

напісаць свае адрасы. Пасля немец з кіем выйшаў на пляц і крычаў: „Белостокская, Барановичская области, кто имеет документы, по четыре становись!” У кожнага быў дакумент і ўсе кінуліся да немца. Зрабіўся балаган, людзі паводзілі сябе горш быдла. Сярод тых, якіх немцы адпусцілі, апынуўся і я.

Вярнуўся я дадому ў другой палове 1941 года. У Орлі па панадворках стаялі нямецкія машыны, а ў хатах кватараваліся салдаты. Маёй дачцэ Веры скончыўся тады годзік. Адзін з немцаў браў маю дачушку на калені і плакаў. Відаць, такое ж малое дзіця пакінуў ён на сваёй бацькаўшчыне.

**Саевіч Валянціна, Старое Ляўкова:**

Вайна пачалася ў нядзелю раненька, а ўжо ў чацвер раніцаю ў Ляўкове немцы былі. З Ахрымоў прыйшлі, цераз мост на, як мы называлі, выгане, дзе цяпер кладка. Цэлы дзень ехалі, але ім брамы не стаўлялі. Мы там ваду цягалі іхнім коням, то я аж падвечар дахаты вярнулася; матарызацыя была, але не такая як цяпер. Бою не было, але многа рускага войска ў лесе, у Лядскім, асталося; пасля яны па адным, па двaіх прабіраліся на ўсход. Заходзілі да нас, бо мы недалёка рэчкі жылі, „пакушаць” прасілі. А каля Фанасёвае хваіны многа самаходаў устрагла ў пяску.

**Сакалоўскі Уладзімір, Сухінічы:**

У нядзелю, калі пачалася нямецка-савецкая вайна, у нашай вёсцы ніхто яшчэ пра яе не ведаў. Толькі калі пачулі выбухі ад Гродна і паказаўся дым, тады людзі даведаліся, што вайна. Нас, дапрызыўнікоў, паклікалі ў сельсавет, што ў пасляпамешчыцкім доме быў, у маёнтку пана Яварoўскага ў Мяшкініках. Меў прыехаць дэлегат і абвясціць, што нас бяруць у армію. Ніхто не прыехаў і мы вярнуліся.

У панядзелак паявіліся адзінокія салдаты, з жыта павыходзілі. А ў аўторак вялікая група савецкіх салдат ішла на захад; ад Крынак ішлі танкі. У чацвёртым дні вайны паявіліся нямецкія самалёты і сталі бамбіць савецкія танкі па лясах. Паявілася многа савецкага войска, паакопваліся. Бамбёжка тая доўжылася пяць дзён.

Людзі павыганялі жывіну. Я на каня сеў і ў поле ўцёк, недалёка, мо з чатырыста метраў. Немцы сталі па жывіне бомбы кідаць. Забілі аднаго байца і многа жывіны пабілі; з нашых людзей нікога не забілі. Кабыла мая спалохалася бомбаў, скінула мяне, коні ўцяклі і я за імі пагнаўся.

Людзі сталі капаць ямы і хавацца ў іх. І я цэлую ноч у яме за вёскай пралежаў. Відаць было, што танкі адступаюць на ўсход, і многа вой-

ска ішло. Савет адзін стаў страляць і траіх чалавек з вёскі забіў, што не схаваліся.

Рана паўставалі і сталі ўглядацца: не было ні саветаў, ні немцаў, толькі пакінутыя танкі або самаходы стаялі. А немцаў ужо на ўсходзе пабачылі, на матацыклах каля Бабікаў; і там яны сталі акопвацца. Толькі пасля адна легкавушка прыехала і двух немцаў у ёй, аглянулі разбіты танк. Мой тата ўмеў па-нямецку і яму сказалі сабраць яйкі, масла і сала раненым. Мой тата стаў арганізаваць зборку. Немцы паехалі, але прыехалі іншыя, забралі і павезлі.

**Свіцкі Яўген, Ячна:**

22 чэрвеня 1941 года немец напаў на рускіх. Немец неба ўкрыў самалётамі. Недалёка Ліпска была руская застава, то немцы білі па Ліпску з гармат. Да нас немцы прыйшлі на другі дзень. Нямецкае войска заліло дарогі, бо рускія нават мастоў не пазрывалі. У нас кватараваліся лейтэнанты, іх сем'і пааставаліся і па гаспадарах жылі.

Каля Гродна сорак тысяч рускіх салдат у абозе было. Нашы вазілі ім правіянт. Жаль было на іх глядзець. Як адзін дастаў кавалак хлеба, то дзесяць на яго нападалі. Адны яму капалі, а іншыя насілі і клалі трупы; усе яны там і пагінулі.

**Секаноўскі Барыс, Барысаўка:**

У 1941 годзе немцы наступалі фронтам, тыральерай, саветы ўцякалі гасцінцам. Каля Галяковай Шыі стральба была, рускія нямецкую гармату разбілі, а сваю зачапілі і ўцяклі. Да абеду адна часць немцаў дайшла да Каралюкоў і ў Крыніцы начавала. Па абедзе прыйшлі немцы ад Рэпіск і ў нас заначавалі: частка вартавала ў акопах, а апошнія начавалі ў хатах. На досвітку немцы паўставалі, прыехала кухня, паснедалі і пайшлі на Нараўку; рускіх ужо не было.

**Філіманюк Васіль, Мора:**

Перад вераломным нападзеннем гітлераўскай Германіі на Савецкі Саюз мяне змабілізавалі ў Чырвоную Армію. Знаходзіўся я ў савецкай ваеннай часці ў лесе за Бельскам-Падляшскім, каля Грабаўца. Немцы нас так разбамбілі, што я з вялікімі цяжкасцямі дабраўся дахаты. Даўжэйшы час яшчэ ў вёсцы немцы прыглядаліся ці я, брытагаловы, не з'яўляюся салдатам Чырвонай Арміі. Аднак пераканаўшыся, што ў мяне жонка і дзеці, аставілі ў спакоі.

**Шакала Люба, Арэшкава:**

Як вайна пачалася, цяжкавата стала. Зайшоў аднойчы да мяне на кватэру старшыня Марчук і кажа: „Шмат параненых салдат прывезлі. Людзям дапамагчы трэба”. Узялі мы хлеба некалькі боханаў ды малако ў гаршчочках і з Марчуковай дачкою ўтраіх да параненых пайшлі. Так некалькі дзён падкармлівалі. Савецкая армія адступала. Хто з параненых мог ісці, дык са сваёй часці адыходзіў. Многія паміралі, захоўвалі іх у Белай. Неўзабаве бацька на фурманцы за мною прыехаў і дамоў забраў. Як прыйшлі немцы, хавацца прыйшлося. Сваякі дапамагалі ды даўнейшыя калегі. Бацькі з малодшым Юркам жылі ў Арэшкаве. Ён дзесяцігодку закончыў. Добру пасаду атрымаў, а я пазней родну вёску пакінула ды паміж чужымі жыла.

**Шыманскія Марыя і Міхал, Орля:**

У чэрвені 1941 года, адступаючы з Орлі, рускія застрэлілі шэсць бязвінных праваслаўных і аднаго старога яўрэя. На нейкі час чырвонаармейцы затрымаліся ў „Чорным лесе” каля Рудутаў. Адна савецкая машына з кулямётам вярнулася ў Орлю, спынілася на мосце, а салдаты сталі браць з ракі ваду. З другога боку, ад рынку, над’ехалі чатыры нямецкія матацыклы. Заўважыўшы рускіх тры матацыклы павярнулі назад, а адзін трапіў пад абстрэл. Адзін матацыкліст загінуў на месцы, другі быў ранены. Саветы пакінулі іх і пагналіся за немцамі ў Орлю. А ў нас, у бацькавай клуні, ляжала ўжо трое раненых чырвонаармейцаў. Бацька рашыўся ўзяць яшчэ гэтага акрываўленага немца. Баяўся, бо не ведаў, хто вернецца ў мястэчка: рускія ці немцы. Неўзабаве выклікалі мясцовага лекара Смульскага, які перавязаў раненых. Некалькі гадзін пазней прыехалі немцы і сталі высвятляць справу. Думалі, што нямецкіх салдат абстралялі партызаны. Ранены немец крычаў з клуні, каб нічога дрэннага нам не рабіць. Немцы кудысьці ад’ехалі, але праз гадзіну зноў прыехала пад дваццаць раз’юшаных салдат. Адзін афіцэр пачаў падпальваць дамы каля гэтага месца, дзе быў забіты немец. Праз акно ўкінуў ён гранату ў хату, што стаяла побач нашай кузні. З хлява выскачыла цяля і немец застрэліў яго. Потым прыбег на наш панадворак. Маці выйшла да яго з паднятымі ўверх рукамі, а ён пусціў кулямётную чаргу ёй пад ногі. Ранены немец ізноў стаў крычаць у абарону бацькоў. Тым часам з клуні выйшаў адзін ранены рускі і стаў прасіць немца: „Пан, возми меня...”, але немец выстраліў яму прама ў жывот. Той яшчэ прамовіў „спасите нас” і памёр. Раз’юшаныя немцы спалілі

тры дамы і ад'ехалі. Свайго раненага забралі толькі на другі дзень раніцай.

У нашай клуні засталося яшчэ двое раненых салдат, але яны схаваліся за прыстаронак і немец іх не бачыў. Потым мой бацька і сусед Андрэй Мураўка вывезлі іх у шпіталь у Бельску. Гэтага забітага немца занеслі мы на насілках на могільнік і пахавалі ля ўвахода. Калі б не доктар Смульскі, які ведаў нямецкую мову і растлумачыў немцам ход сутычкі і пераканаў іх, што ў Орлі няма партызан, немцы спалілі б цэлую Орлю.

— Было так, што калі немцы былі ўжо з танкамі ў Орлі, то рускія, якія былі яшчэ ў „Чорным лесе", паслалі ў разведку салдат з дзесяць. Дайшлі яны да моста перад Орляй, а там было такое нашае сховішча, куды залез немец. Махнуў ён рукою, каб яны падышлі бліжэй. Калі саветы сталі набліжацца, раздалася кулямётная чарга. Некалькі салдат забілі, рэшта ўцякла і хавалася каля яўрэйскай бажніцы.

— З Кашалёў у Орлю ішлі два савецкія салдаты з белай кашуляй на жэрдцы і хацелі здацца немцам. Але тыя толькі пад'ехалі на матацыкле да моста і сталі страляць па іх. Адзін салдат быў забіты і ўпаў у раку. Ляжаў там доўга. Арляне потым выцягнулі труп з ракі і пахавалі на могілках. Другі баец быў цяжка ранены. Заняўся ім доктар Смульскі і адаслаў яго ў шпіталь у Бельску.

— Пад „Чорным лесам" хлопцы пасвілі коней. Немцы пад'ехалі да іх і сталі правяраць, ці няма сярод іх каротка астрыжаных юнакоў. Відаць, шукалі партызан або салдат. Не знайшоўшы нікога падазронага, забралі ў іх дзесятак найлепшых коней.

— Немцы палонных не бралі, а толькі рабавалі самае найлепшае і пёрлі на ўсход. У нашым доме, дзе мы і цяпер жывём, навонкі ў дылях да сёння знаходзяцца асколкі з часоў II сусветнай вайны.